# Чакаць нельга!

## Зварот да Старшыні Вярхоўнага Савета БССР М. І. Дзямянцея і Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР

Сёння ўсяму свету зразумела, што групай службовых асоб у Маскве здзейснена ваенна-наменклатурная змова супроць законна выбранай дзяржаўнай улады як у СССР, так і ў саюзных рэспубліках. Пазіцыя чакання, занятая Вамі, з'яўляецца фактычным пасобніцтвам дзеянням дзяржаўных злачынцаў, якія арганізавалі антыканстытуцыйны пераварот і імкнуцца ўсталяваць у краіне рэжым ваеннай дыктатуры.

Мы вымушаны папярэдзіць Вас аб тым, што адмова ад неадкладнага склікання нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР, ухіленне ад рашучага асуджэння путча, замаруджванне з афіцыйнай заявай аб супрацьзаконнасці ўсіх рашэнняў і ўказаў так званага Дзяржаўнага камітэта па надзвычайнаму становішчу на тэрыторыі Беларускай ССР з'яўляецца па сутнасці садзеяннем у злачынстве.

Беларускі народ добра памятае жудасныя злачынствы сталінскай дыктатуры і не даруе патурання тым, хто зноў імкнецца растаптаць яго суверэнітэт і свабоду.